Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі

*ЗАЦВЯРДЖАЮ*
**Першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь**
________ **А.І. Жук**
03.04. 2009 г.
Рэгістрацыйны № ТД-Д.079/тып.

# ГІСТОРЫЯ СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ КРАІН АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ

**Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці
1-21 03 01 Гісторыя (па накірунках)**

УЗГОДНЕНА
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі
________ **У.Л. Клюня**
4 снежня 2008 г.

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
________ **Ю.І. Міксюк**
03.04. 2009 г.

Першы прарэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
________ **І.В. Казакова**
18.03 2009 г.

Эксперт-нормакантралёр
________ Ф.М. Кляўцэвіч
18.03. 2009 г.

Мінск 2009

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Я.А. Красулін,** дацэнт кафедры гісторыі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук.

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Аддзел гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

Г.А. Космач, загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:

Кафедрай гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта
(пратакол № 8 ад 15.05.2008 г.);

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага універсітэта
(пратакол № 4 ад 22.05.2008 г.);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарных спецыяльнасцях вучэбна-метадычнага аб'яднання вну Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 4 ад 12.09.2008 г.).

Адказны за рэдакцыю: дацэнт Я.А. Красулін

Змест

1. Тлумачальная запіска........................................................ 4

2. Прыкладны вучэбна-тэматычны план....................................... 6

3. Змест вучэбнай дысцыпліны..................................................... 7

4. Крыніцы і літаратура .................................................................. 12

## Тлумачальная запіска

У наш час на тэрыторыі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі пражывае каля 80% усяго насельніцтва нашай планеты. У гэтых рэгіёнах змяшчаюцца эканомікі, якія дэманструюць найбольш дынамічнае развіццё; іх патэнцыял адзін з самых моцных у свеце. Нягледзячы на тэндэнцыі да глабалізацыі, у краінах рэгіёнаў застаецца значным уплыў традыцыйнага грамадства, карані якога знаходзяцца ў эпосе сярэдніх вякоў. У гэты час нараджаецца і распаўсюджваецца ісламская цывілізацыя, афармляюцца новыя палітычныя, эканамічныя і ідэялагічныя інстытуты кітайскай цывілізацыі, ствараецца японская дзяржава, узнікаюць значныя дзяржаўныя ўтварэнні ў чорнай Афрыцы, развіваюцца цывілізацыі дакалумбавай Амерыкі. Большасць інстытутаў, якія нараджаюцца ў сярэднія вякі, працягвае існаваць у больш познія эпохі, і іх вывучэнне дае ключ да разумення тых з'яваў і тэндэнцый развіцця, якія назіраюцца, у тым ліку, і на пачатку XXI ст.

Праграма па гісторыі сярэдніх вякоў краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі, перш за ўсё, арыентавана на фармаванне ўяўленняў аб найбольш важных аспектах развіцця асноўных нееўрапейскіх цывілізацыяў, у тым ліку аб складанні і функцыянаванні палітычных, эканамічных і сацыяльных інстытутаў. Пры гэтым падкрэсліваецца значная роля ідэялагічных вучэнняў, якія ўплывалі на карціну свету народаў Азіі, Афрыкі і Амерыкі, з'яўляючыся важным фактарам у жыцці і дзейнасці грамадстваў.

Адной з асноўных праблемаў вывучэння гісторыі сярэдніх вякоў у нееўрапейскіх краінах з'яўляецца іх тыпалогія. Таму ў праграме курсу значнае месца адводзіцца праблеме пераемнасці з больш раннімі эпохамі, а таксама вывучэнню паняцця "феадалізм" і магчымасці прымянення яго ў дачыненні да ўсходніх грамадстваў. Аналіз розных варыянтаў напаўнення тэрміну "феадалізм" і суаднясенне іх з тымі мадэлямі, якія існавалі ў краінах Усходу і якія ў часткі навуковай і вучэбнай літаратуры падаюцца як "феадальныя", вучыць студэнтаў асэнсавана карыстацца навуковымі тэрмінамі, не ператвараючы іх у штампы.

Істотным момантам у працэсе вывучэння гісторыі краін Усходу, Афрыкі і Амерыкі з'яўляецца пераадоленне традыцыйнага еўропацэнтрысцкага падыходу, які замінае аб'ектыўнаму і адэкватнаму ўспрыяццю ролі нееўрапейскіх грамадстваў у гісторыі чалавецтва і іх патэнцыялу. Перад студэнтамі ў рамках курса стала ставіцца праблема дыхатаміі "чалавек Захаду – чалавек Усходу" для самастойных пошукаў адказу на прыроду ўзнікнення гэтай дыхатаміі. Увага надаецца асаблівасцям карціны свету і менталітэту прадстаўнікоў усходніх ды іншых нееурапейскіх грамадстваў. Знаёмства з сярэдневяковымі нееўрапейскімі крыніцамі, у тым ліку з мастацкімі і мемуарнымі творамі, дае студэнтам магчымасць больш шырока глядзець на праблему міжцывілізацыйнага ўзаемадзеяння. У праграме асабліва падкрэсліваецца ўнёсак нееўрапейскіх сярэдневяковых цывілізацый у сусветную культуру, у тым ліку роля ісламскай цывілізацыі ў станаўленні

сучаснай еўрапейскай філасофіі і навукі, а таксама ўплыў на архітэктуру, выяўленчае мастацтва, масавую культуру.

Вывучэнне дысцыпліны "Гісторыя сярэдніх вякоў краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі" разлічана максімальна на 58 гадзін, у тым ліку 34 аўдыторных (20 гадзін лекцый, 14 гадзін практычных і семінарскіх заняткаў).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны **ведаць:**

– асаблівасці сацыяльнай структуры і адносін сярэдневяковага азіяцкага грамадства;

– асноўныя падзеі ўнутрыпалітычнай гісторыі сярэдневяковых дзяржаў Азіі, Афрыкі і Амерыкі;

– характарыстыкі і тыповыя рысы азіяцкага грамадства ў сярэдневякоўі;

– найбольш важныя дасягненні і асаблівасці азіяцкай, афрыканскай і амерыканскай культур сярэдневякоўя;

– асноўны комплекс крыніц па гісторыі сярэдніх вякоў, асноўныя дасягненні сусветнай гістарычнай навукі ў галіне вывучэння Азіі, Афрыкі і Амерыкі.

Студэнты павінны **ўмець:**

– прымяняць атрыманныя веды для вырашэння канкрэтных педагагічных, метадычных, інфармацыйна-пошукавых, навуковых інавацыйных і іншых задач;

– аналізаваць крыніцы па гісторыі сярэдніх вякоў і на іх падставе рабіць самастойныя высновы;

– даваць самастойныя ацэнкі, рэферыраваць навуковыя працы па гісторыі сярэдніх вякоў краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі;

– выяўляць і крытычна ацэньваць сутнасць асноўных з'яў і працэсаў у гісторыі сярэдневяковых Азіі, Афрыкі і Амерыкі;

– знаходзіць агульнае і адметнае ў развіцці дзяржаў і грамадстваў сярэдневяковых Азіі, Афрыкі і Амерыкі;

– характарызаваць ролю і месца сярэдневяковых Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў гістарычным развіцці чалавецтва.

## Прыкладны вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзелаў (модуляў) і тэм | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Аудыторных | З іх | |
| | | | Лекцыі | Семі-нары |
| 1. | Уводзіны ў гісторыю краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў сярэднія вякі | 2 | 2 | |
| 2. | Нараджэнне ісламскай цывілізацыі і яе ўплыў на народы Блізкага і Сярэдняга Усходу | 14 | 8 | 6 |
| 3. | Індыя і краіны паўднёва-ўсходняй Азіі і Далёкага Усходу ў сярэднія вякі | 10 | 6 | 4 |
| 4. | Культуры і цывілізацыі трапічнай Афрыкі і Амерыкі ў сярэднія вякі | 8 | 4 | 4 |
| | **Усяго** | **34** | **20** | **14** |

## 1. УВОДЗІНЫ Ў ГІСТОРЫЮ КРАІН АЗІІ, АФРЫКІ І АМЕРЫКІ Ў СЯРЭДНІЯ ВЯКІ.

Прадмет, задачы і праблемы курса гісторыі краін Азіі Афрыкі і Амерыкі ў сярэднія вякі. Змест паняцця "сярэднія вякі" ў дачыненні да нееўрапейскіх цывілізацыяў. Асноўныя праблемы перыядызацыі. Фармацыйны, цывілізацыйны і іншыя падыходы да вывучэння гісторыі нееўрапейскіх цывілізацыяў. Паняцце "феадалізм" і ягоныя тлумачэнні рознымі гістарычнымі школамі. Праблема правамоцнасці прымянення тэрміну "феадалізм" у дачыненні да нееўрапейскіх грамадстваў. Праблема еўропацэнтрызму ў вывучэнні краін Азіі, Афрыкі і Амерыкі. Дыхатамія "Захад-Усход", яе ўплыў на разуменне і выучэнне нееўрапейскіх цывілізацый. Асаблівасці ўсходніх цывілізацый. Паняцце "ўалад-ўласнасць". Агульныя рысы палітычных і сацыяльна-эканамічных інстытутаў. Роля сацыяльнага падзелу грамадстваў і праблема сацыяльнай мабільнасці. Месца сярэдневяковых цывілізацый Азіі, Афрыкі і Амерыкі ў сусветнай гісторыі. Іх уплыў на сучасныя палітычныя і ідэялагічныя працэсы, а таксама на масавую культуру.

## 2. НАРАДЖЭННЕ ІСЛАМСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА НАРОДЫ БЛІЗКАГА І СЯРЭДНЯГА УСХОДУ.

Паняцце "ісламская цывілізацыя". Геаграфія і перыядызацыя. Гісторыя вывучэння. Асноўныя крыніцы па галоўных рэгіёнах ісламскай цывілізацыі.

**Нараджэнне ісламскай рэлігіі.** Геаграфічныя ўмовы і культурна-гістарычныя вобласці Аравійскай паўвыспы. Лад жыцця, традыцыі і асноўныя заняткі яе насельніцтва. Рэлігійныя ўяўленні. Палітычнае становішча ў Аравіі ў VI ст.. Мека. Пачатак прароцкай дзейнасці Мухамеду. Змест ягоных казанняў. Хіджра і яе значэнне для ісламскай цывілізацыі. Ансары і мухаджыры. Ісламская грамада (ума). Барацьба з курайшытамі. Пачатак складання інстытутаў ісламскай дзяржавы. Перамога Мухамеду над меканцамі. Адносіны з арабскімі плямёнамі.

**Арабскі халіфат. Афармленне ісламскай дзяржавы.** Смерць Мухамеду. Народжанне інстытуту халіфату. Першыя чатыры халіфы. Пачатак знешняй экспансіі. Пошукі арганізацыі ўнутранага жыцця. Грамадзянская вайна 656-661 гг.. Раскол умы на харыджытаў, сунітаў і шыітаў. Прыход да ўлады дынастыі Амеядаў. Падзенне значэння Мекі. Апагей знешняй экспансіі. Палітыка ісламізацыі і арабізацыі на заваяваных землях. Праблемы з арганізацыяй адміністравання. Барацьба супраць Амеядаў.

**Абасідская рэвалюцыя і халіфат Абасідаў.** Прыход да ўлады абасідскай дынастыі. Сутнасць "Абасідскай рэвалюцыі". Замацаванне ў халіфаце традыцыйных іранскіх інстытутаў. Пачатак працэсу распаду дзяржавы.

Аслабленне ўлады халіфу. Халіфат і сяльджукі. "Рэнесанс" халіфскай улады ў XII ст.. Адносіны з Харэзмам. Мангольскае заваяванне і канец Абасідскага халіфату. Роля Егіпту ў далейшым існаванні інстытуту халіфату.

**Роля рэлігіі ў існаванні ісламскай дзяржавы.** Асноўныя палажэнні ісламскай рэлігійнай дактрыны. Сунізм і шыізм. Шарыят як сістэма ісламскага права. Яго крыніцы і школы. Палітычныя інстытуты. Паняцце маёмасці. Сістэма землекарыстання і фіскальная сістэма.

**Іран у эпоху сярэднявечча.** Змест паняцця "Іран" у дачыненні да эпохі сярэдніх вякоў. Геаграфічныя ўмовы, культурна-гістарычныя абводы. Сасанідскі Іран. Зараастрызм. Маніхейства і маздакізм. Рэформы Хасрова I. Процістаянне з Візантыяй.

Іран падчас арабскага заваявання. Арабізацыя і ісламізацыя ў Іране. Узнікненне мясцовых дынастыяў у IX-XI стст.. Буіды і іх роля ў лёсе халіфату Абасідаў. Саманіды і "іранскі рэнесанс".

Мангольскае заваяванне. Дзяржава хулагуідаў. Складанне руху сербедараў і барацьба супраць манголаў. Узнікненне сербедарскіх дзяржаў і падзенне ўлады хулагуідаў.

Жыццё Тымура. Заваяванне Ірану Тымурам, ягоныя погляды на палітычную ўладу і метады кіравання. Заваяванні Тымура на Блізкім Усходзе. Адносіны з Залатой Ардой і ВКЛ. Смерць Тымура і складанне дзяржаў тымурыдаў. Дзяржавы Ак-Каюнлу і Кара-Каюнлу.

**Цюркі .** Этнагенез цюркаў. Цюрцкія каганаты VI-VII стст.. Адносіны з Іранам і Візантыяй. Экспансія цюркаў на захад. Сяльджукі. Стварэнне Сяльджуцкага султанату. Сяльджукі і Абасідскі халіфат. Распад султанату.

Палітычныя ўтварэнні цюркаў на Блізкім Усходзе. Адносіны з дзяржавамі крыжакоў. Праблема ўзаемадзеяння хрысціянскай і ісламскай цывілізацыяў.

Румскі султанат, ягоная палітычная і эканамічная арганізацыя. Мангольскае заваяванне і пачатак эпохі бейлікаў. Асманскі бейлік і стварэнне асманскай дзяржавы. Складанне эканамічных і палітычных існтытутаў. Улада асманскага султана. Стварэнне існтытута капыкулу. Янычары. Тэрытарыяльная экспансія асманаў. Заваяванні на Балканах. Крызіс султанату ў канцы XIV – пачатку XV ст.. Канец эпохі бейлікаў. Заваяванне Канстантынопалю. Асманская дзяржава ў друг. пал. XV ст..

## 3. ІНДЫЯ І КРАІНЫ ПАЎДНЁВА-ЎСХОДНЯЙ АЗІІ І ДАЛЁКАГА УСХОДУ Ў СЯРЭДНІЯ ВЯКІ.

**Індыя ў сярэднія вякі.** Гістарыяграфія і асноўныя крыніцы. Асаблівасці сацыяльнага і палітычнага развіцця Індыі ў эпоху сярэдніх вякоў. Індуізм. Варны і касты. Прынцып джаджмані.

Палітычная гісторыя Індыі ў эпоху ранняга сярэднявечча. Дзяржава Гуптаў. Дзяржавы VII-X стст.. Адносіны з мусульманскімі палітычнымі

утварэннямі Аўганістану. Узнікненне Дэлійскага султанату. Унутраная структура султанату. Праблемы суіснавання ісламскай і індуісцкай структураў. Паўночная Індыя ў XV ст.. Паўднёвая Індыя ў эпоху сярэдніх вякоў.

**Кітай у эпоху сярэдніх вякоў.** Гістарыяграфія і асноўныя крыніцы. Перыядызацыя гісторыі сярэдневяковага Кітая. Асаблівасці кітайскай карціны свету. Асаблівасці палітычнай, эканамічнай і сацыяльнай сістэмы. Ідэялогіі сярэдневяковага Кітая. "Трыяда вучэнняў". Феномен кітайскага будызму. Канцэпцыя вярхоўнай улады. Знешнепалітычная канцэпцыя Кітая.

Эпоха Трох царстваў і яе месца ў гісторыі Кітая. Аб'яднанне дзяржавы пад уладай дынастыі Цзінь. Рэформы Сыма Яня. Прыход паўночных качэўнікаў і стварэнне іх дзяржаваў. Адносіны паміж прыхаднямі і кітайцамі. Афармленне культурнага падзелу краіны на Поўнач і Поўдзень. Фармаванне новых інстытутаў ў сістэме землекарыстання.

Аб'яднанне краіны ў друг. пал. VI ст.. Палітыка імператараў дынастыі Суй. Прыход да ўлады дынастыі Тан. Складанне новых інстытутаў дзяржаўнай улады. Адміністрацыйны апарат. Новы адміністрацыйны падзел. Цывільныя і вайсковыя адміністрацыйныя адзінкі. Інстытут цзэдушы. Закакнадаўства эпохі Тан. Сістэма камплектацыі чыноўніцкіх кадраў.

Унутранныя праблемы дынастыі Тан. Крызіс надзельнай сістэмы землекарыстання. Унутрыпалітычны крызіс сярэдзіны VIII ст.. Зямельная рэформа 780 г.. Распад танскай дзяржавы.

Палітычная раздробленасць X ст.. Прыход да ўлады дынастыі Сун. Знешнепалітычнае становішча Кітая ў X-XII стст.. Узнікненне дзяржаўных утварэнняў качавых народаў на паўночных межах Кітая. Дамовы Кітая з Ляо і Заходняй Ся. Узнікненне чжурчжэньскай дзяржавы Цзінь. Экспансія чжурчжэняў і ўзнікненне Паўднёвай Сун.

Эканамічнае і культурнае развіццё Кітая ў эпоху Сун. Рост гарадоў. Неаканфуцыянства.

Дзейнасць Тэмучыну і ўзнікненне мангольскай дзяржавы. Пачатак мангольскага заваявання Кітая. Адносіны манголаў з Паўднёвай Сун. Другі этап мангольскага заваявання. Усталяванне дынастыі Юань. Палітыка манголаў у дачыненні кітайцаў. Тэндэнцыі да кітаізацыі мангольскай дынастыі.

Барацьба кітайцаў супраць мангольскага панавання. Патаемныя таварыствы. Дзейнасць Чжу Юаньчжана і ўзнікненне дынастыі Мін. Выгнанне манголаў. Уплыў мангольскага заваявання на далейшыя адносіны паміж Кітаем і Манголіяй.

Асаблівасці метадаў кіравання імператараў мінскай дынастыі. Змены ў цэнтральным апараце ўлады. Роля еўнухаў.

Адносіны з вонкавым светам. Дынастыя Мін і Тымур. Паходы "залатога флоту" Чжэн Хэ. Сучасныя гіпотэзы адносна вынікаў і значэння гэтых паходаў.

Кітайскае грамадства ў эпоху сярэдніх вякоў. Кітайскі горад і ягоныя абітальнікі. Кітайская вёска. Месца розных рэлігійных вучэнняў у жыцці кітайскага грамадства. Сістэма этычных і эстэтычных каштоўнасцяў.

**Японія ў эпоху сярэдніх вякоў.** Гістарыяграфія. Асноўныя крыніцы па гісторыі Японіі ў сярэднія вякі. Раннія культуры Японскага архіпелагу. Складанне першых палітычных утварэнняў у перш. пал. І тыс. н.э.. Адносіны з матэрыком. Складанне японскай дзяржавы пад уплывам кітайскай дзяржаўнай мадэлі. Трансфармацыя запазычаннай мадэлі ў эпоху Хэян. Сацыяльна-палітычныя працэсы ў Японіі ў эпоху ранняга сярэднявечча. Складанне сістэмы сёгунату. Сёгунат Мінамота. Роля вайсковага саслоўя ў жыцці краіны. Барацьба супраць манголаў.

Процістаянне бакуфу і імператарскага двара ў XIV ст.. Сёгунат Асікага. Складанне інстытуту даймё, іх роля ў жыцці краіны. Аслабленне цэнтральнай улады. Пачатак палітычнай раздробленасці. Вайна гадоў Онін. Японія ў перш. пал. XVI ст.

Культура Японіі ў сярэднія вякі.

**Карэя ў эпоху сярэдніх вякоў.** Сучасныя канцэпцыі гісторыі Карэі ў перыяд старажытнасці і сярэдніх вякоў. Асноўныя крыніцы па гісторыі сярэдневяковай Карэі.

Эпоха Трох дзяржаваў. Адносіны з Кітаем і Японіяй. Дзяржава Аб'яднанае Сіла. Дзяржава Кар'ё. Палітычная і эканамічная сістэма. Сацыяльны падзел грамадства. Пазямельныя адносіны. Асаблівасці знешнепалітычнай канцэпцыі.

Мангольскія заваяванні. Крызіс канца XIV ст.. Рэформы 90-х гг. XIV ст. Прыход да ўлады дынастыі Лі. Палітычнае і эканамічнае развіццё Карэі ў XV ст.

**Краіны Паўднёва-Усходняй Азіі ў эпоху сярэдніх вякоў.** Паняцце "Паўднёва-Усходняя Азія". Асаблівасці развіцця краін рэгіёну ў пазначаны перыяд. Распаўсюджанне будызму. Палітычная гісторыя Вьетнаму, Мьянмы, Камбоджы ў сярэдневякоўі.

## 4. КУЛЬТУРЫ І ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ТРАПІЧНАЙ АФРЫКІ І АМЕРЫКІ Ў СЯРЭДНІЯ ВЯКІ

**Культуры трапічнай Афрыкі.** Паняцце "трапічная Афрыка", яе геаграфічныя абводы. Культурныя агмені на тэрыторыі трапічнай Афрыкі. Гісторыя вывучэння. Асноўныя крыніцы.

Геаграфічныя і кліматычныя ўмовы Заходняй Афрыкі. Насельніцтва рэгіёну, ягоныя асноўныя заняткі. Удзел у транссахарскім гандлі. Уплыў ісламу. Дзяржавы Гана, Малі, Сонгай.

Палітычныя ўтварэнні ёрубаў. Палітычная і сацыяльная арганізацыя гарадоў-дзяржаваў. Дзяржавы Бянін і Оё. Матэрыяльная культура народаў Нігерыі і Ганы ў сярэднія вякі.

Культуры Усходняй Афрыкі. Палітычныя ўтварэнні Самалі. Грамадства Зімбабвэ.

**Культуры і цывілізацыі Амерыкі.** Гісторыя Новага Свету ў кантэксце сусветнай гісторыі. Значэнне культур і цывілізацый дакалумбавага перыяду для жыцця сучасных краін Лацінскай Амерыкі. Гістарыяграфія дакалумбавага перыяду. Крыніцы па вывучэнні дакалумбавага перыяду гісторыі Амерыкі. Праблема засялення Амерык і этнагенез амерындаў. Культуры каменнага веку. Сутнасць архаічнага перыяду.

Цывілізацыйныя агмені. Мезаамерыка. Цывілізацыі альмекаў і сапатэкаў. Ісапа. Класічная цывілізацыя мая. Тэаціўакан. Цывілізацыі тальтэкаў і міштэкаў. Уастэкі. Культуры зоны Усходніх Лясоў і Паўднёвага Захаду ЗША. Посткласічная цывілізацыя мая і дзяржава астэкаў.

Зона Цэнтральных Андаў. Геаграфічныя і кліматычныя ўмовы. Першыя цывілізацыі Цэнтральных Андаў. Дзяржава інкаў. Навуковыя і культурныя дасягненні.

## Крыніцы і літаратура

### Крыніцы


1. Бичурин Н.Я. Собрание сведений о народах Средней Азии в древние времена. Т. 1-3. М.-Л., 1950-1953.
2. Гийасаддин Али. Дневник похода Тимура в Индию. М., 1958.
3. Древние и средневековые источники по этнографии и истории Африки южнее Сахары Арабские источники VII -X вв.. М., 1960.
4. Древние и средневековые источники по этнографии и истории Африки южнее Сахары Арабские источники X - XII вв.. М., 1965.
5. Древние и средневековые источники по этнографии и истории Африки южнее Сахары Арабские источники XII -XIII вв. - М., 1985.
6. Древние и средневековые источники по этнографии и истории Африки южнее Сахары. Арабские источники XIII-XIV вв. М., 2002
7. Инка Гарсиласо де ла Вега. История государства инков. Л., 1974.
8. История Африки в древних и средневековых источниках. М., 1990.
9. Ким Бусик. Самкук саги. М., 1959.
10. Книга Марко Поло. М., 1955.
11. Коран. М. 1963.
12. Ланда, Диэго де. Сообщение о делах в Юкатане. М., 1994.
13. Мункыз, Усамма ибн. Книга назидания. М., 1958.
14. Письмена на воде. Первые наставники Чань в Китае. М., 2000.
15. Повесть о доме Тайра. М., 2005.
16. Пополь-Вух. М., 1993.
17. Хилал ас-Саби. Установления и обычаи двора халифов. М., 1983.
18. Хрестоматия по истории Китая в средние века. М., 1960.
19. Ши Найань. Речные заводи. М., 1992.


### Асноўная літаратура


1. Васильев Л.С. История Востока. Т. 1. М., 2001.
2. История стран Азии и Африки в средние века. Ч. I и II. М., 1987.


### Дадатковая літаратура


1. Алаев Л.Б. К типологии феодализма на Востоке // «Народы Азии и Африки». 1977, № 4.
2. Алаев Л.Б. Сельская община в Северной Индии: Основные этапы эволюции. М., 1981.
3. Алаев Л.Б. Формационные черты феодализма и Восток // «Народы Азии и Африки». 1987, № 3.
4. Африка еще не открыта. М., 1967.
5. Африка. Культурное наследие и современность. М., 1985.
6. Африка. Энциклопедический словарь. Т.1-2. М., 1986-1987.
7. Баглай В.Е. Ацтеки. М., 1998.

8. Бартольд В.В.Образование империи Чингис хана // Бартольд В.В. Собр.соч.. Т.5. М., 1968.
9. Берзин Э.О. Юго-Восточная Азия в XIII-XVI вв. М., 1982.
10. Бокщанин А.А. Императорский Китай в начале XV в. М., 1976.
11. Бокщанин А.А. Китай и страны Южных морей в XIV-XVI вв. М., 1968.
12. Бокщанин А.А. Современные историки КНР о проблемах феодализма в Китае. М., 1998.
13. Большаков О.Г. История Халифата. Т.1-3-. М., 1989-1998.
14. Буддизм в Японии. М., 1993.
15. Бутин Ю.В. От Древнего Чосона к Трем государствам. Новосибирск, 1984.
16. Бэшем А.Л. Чудо, которым была Индия. М., 1977.
17. Бютнер Т. История Африки с древнейших времен. М., 1981.
18. Васильев Л.С. История религий Востока. М., 1983.
19. Владимиров Б.Я.Чингис хан. М., 1998.
20. Воробьев М.В.Япония в III-VII вв. М., 1980.
21. Всеволодов И.В. Бирма. Религия и политика: Буддийская сангха и государство. М., 1978.
22. Гасратян М.А., Орешкова С.Ф., Петросян Ю.А. Очерки истории Турции. М., 1983.
23. Гаудио А. Цивилизация Сахары. М., 1977.
24. Гафуров Б.Г. Таджики. М., 1972.
25. Говорят африканские историки. М., 1977.
26. Горегляд В.Н. Японская литература VIII-XVI вв. Спб., 1997.
27. Грюнебаум фон Г.Э.Классический ислам. 600-1258. М., 1986.
28. Гуляев В.И. Города-государства майя. М., 1979.
29. Давидсон А.Б., Макрушин В.А. Облик далекой страны. М., 1975.
30. Далай Ч. Монголия в XIII-XIV вв. М., 1983.
31. Долин А.А, Попов Г.В. Кэмпо – традиции воинских искусств. М., 1991.
32. Дэвидсон Б. Африканцы. Введение в историю культуры. М., 1975.
33. Еремеев Д.Е. Этногенез турок. М., 1971.
34. Зарин В.А. Запад и Восток в мировой истории XIV - XIX вв. М., 1991.
35. Ислам в Западной Африке. М., 1988.
36. Ислам. Энциклопедический словарь. М., 1991
37. Историография стран Востока: Проблемы феодализма. М., 1977.
38. История Африки в древних и средневековых источниках. Хрестоматия. М., 1990.
39. История Индии в средние века. М., 1968.
40. История Кампучии: Краткий очерк. М., 1981.
41. История культуры Японии. Обзор. Изд. министерства иностранных дел Японии. 1992.
42. История Тропической Африки (с древних времен до 1800 г.). М., 1984.
43. Источниковедение африканской истории. М., 1977.
44. Иэнага Сабуро. История японской культуры. М., 1972.
45. Керам К.В. Первый американец. М., 1979.

46.Кинжалов Р.В. Культура древних майя. Л., 1971.
47.Киселев Г.С. Доколониальная Африка. Формирование классового общества: состояние проблемы и перспективы ее разработки, М., 1985.
48.Книга японских обыкновений. Сост. А.Н.Мещеряков//Восточные арабески. М., 1999.
49.Кобзев А.И. Учение Ван Янмина и классическая китайская философия. М., 1983
50.Кобищанов Ю.М. Северо-Восточная Африка в раннесредневековом мире. М., 1980.
51.Колесников А.И. Завоевание Ирана арабами. М., 1982.
52.Конрад Е.М. Запад и Восток. М., 1972.
53.Кочакова Н.Б. Рождение африканской цивилизации, М., 1986.
54.Крюков М.В., Малявин В.В., Софронов М.В. Китайский этнос в средние века (VII-XIII в.). М., 1984.
55.Куббель Л.Е. Сонгайская держава. М., 1974.
56.Куббель Л.Е. Страна золота. М., 1990.
57.Ламберг-Карловски К., Саблофф Е. Древние цивилизации: Ближний Восток и Мезоамерика. М., 1992.
58.Маке Ж. Цивилизации Африки южнее Сахары. М., 1974.
59.Малявин В.В.Сумерки Дао. Культура Китая на пороге Нового времени. М., 2000.
60.Маркарьян С.Б., Молодякова Э.В. Праздники в Японии. М., 1990.
61.Массе А. Ислам. М., 1982.
62.Медведев Е.М. Очерки истории Индии до XIII века. М., 1990.
63.Мещеряков А.Н. Древняя Япония. Буддизм и Синтоизм. М., 1987.
64.Мириманов В.Б. Искусство Тропической Африки. М., 1986.
65.Никифоров В.Н. Восток и всемирная история. М., 1975.
66.Новичев А.Д. История Турции. Т.1-4. Л., 1963-1978.
67.Панова В.Ф., Вахтин Ю.Б. Жизнь Мухаммеда. М., 1991.
68.Пасков С.С. Япония в раннее средневековье VII-XII века. М., 1987.
69.Петросян Ю.А. Османская империя. Могущество и гибель. М., 1990.
70.Пиотровский М.Б. Южная Аравия в раннее средневековье. М., 1985.
71.Поршнева Е.Б. Религиозные движения позднесредневекового Китая. Проблемы идеологии. М., 1991.
72.Рабство в странах Востока в средние века. М., 1986.
73.Седов Л.А. Ангкорская империя. М., 1967.
74.Семенова Л.А. Из истории фатимидского Египта. М., 1984.
75.Сила-Новицкая Т.Г.Культ императора в Японии. М.,1990.
76.Синицына И.Е. Человек и семья в Африке (по материалам обычного права). М., 1988.
77.Содди Д. Великие культуры Месоамерики. М., 1985.
78.Средневековый Восток: История, культура, источниковедение. М., 1980.
79.Строева Л.В. Государство исмаилитов в Иране в XI-XIII вв. М., 1978.
80.Стулова Э.П. Китайский город. XI-XIII вв. М., 1979.

81. Уотт У.М. Влияние ислама на средневековую Европу. М., 1976.
82. Урсу Д.П. Историография истории Африки. М., 1990.
83. Фильштинский И.М.История арабов и халифата (750-1517гг.).М.,1999.
84. Фицджеральд С.П. Китай. Краткая история культуры. Спб,. 1998
85. Фрай Р. Наследие Ирана. М., 2002.
86. Ханин З.Я. Социальные группы японских париев. М., 1973.
87. Чернецов С.Б. Эфиопская феодальная монархия в XIII - XVI вв. М., 1982.
88. Шинни М., Древние африканские государства. М., 1982.
89. Шпажников Г.А. Религии стран Африки. Справочник. М., 1981.
90. Эберхард В. Китайские праздники. М., 1977.
91. Юго-Восточная Азия в мировой истории. М., 1977.